*Повязі*

# «Віват талент»

**Дзень, які мусіў стаць канцом свету, стаўся для канцэртнага аркестра духавых і ўдарных інструментаў «Светач» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў днём перамогі на Міжнародным конкурсе выканальніцкага майстэрства «Віват талент» у Санкт-Пецярбургу.**

**Павел САПОЦЬКА, фота аўтара**

Мерапрыемства прайшло ў межах адной з цэнтральных перадначавагодніх падзей культурнага жыцця паўночнай сталіцы — Пецярбургскіх Каляндных Асамблей. Яго арганізатарамі сталі творчы цэнтр «Натхненне» сумесна з камітэтамі па культуры і адукацыі Санкт-Пецярбурга і Ленінградскай вобласці, а таксама Заканадаўчым Сходам Санкт-Пецярбурга. Конкурс сабраў прафесійныя і аматарскія калектывы з розных краін свету. Сярод іх — калектывы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а таксама спявак Аляксандр Мурашка. Менавіта дзякуючы фінансавай падтрымцы апошняга стаў магчымым удзел беларусаў у прэстыжным музычным конкурсе. Аляксандр Мурашка, вядомы ў Беларусі прафесійны спявак і мецэнат, выканаў некалькі рамансаў у суправаджэнні аркестра «Светач».

У розных намінацыях канцэртны аркестр духавых і ўдарных інструментаў «Светач» (мастацкі кіраўнік Віктар Валатковіч, галоўны дырыжор Аляксандр Фёдараў) заняў першае месца, брас-квінтэт пад кіраўніцтвам Аляксандра Карацеева — другое, капэла беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды» пад кіраўніцтвам Ігара Мангушава — трэцяе.



*Аркестр «Светач» і Аляксандр Мурашка.*

Незвычайна якасны ўзровень, паводле меркавання аўтарытэтнага міжнароднага журы пад старшынствам заслужанага артыста Расіі Аляксандра Шусціна, характэрны для выканання твораў аркестрам «Светач», які аднойчы ўжо ўзыходзіў на музычны алімп на Міжнародным фестывалі духавой музыкі «Сурмы» (Украіна). Дарэчы, на конкурсе выконвалася музыка, заснаваная на беларускім матэрыяле.

Прыемна здзівілі гледачоў юныя беларускія музыкі — выхаванцы прафесара БДУКіМ Аляксандра Карацеева і выкладчыка Дзіцячай школы мастацтваў № 19 г. Мінска Ганны Белан, якая таксама выканала на фартэпіяна некалькі джазавых кампазіцый беларускіх і замежных аўтараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ